4. Паводле тыпу маўлення сачыненне будзе апавяданнем. Успомніце будову тэксту-апавядання.

5. Па форме сачыненне будзе маналогам (апавяданне можа весціся ад 1-й асобы). Калі ў падарожжы будуць прымаць удзел іншыя персанажы, то ў тэкст сачынення будуць уключаны дыялог, простая мова.

6. Сачыненне павінна быць напісана ў мастацкім стылі. Таму разам з агульнаўжывальнай лексікай старайцеся выкарыстоўваць вобразныя сродкі мовы: параўнанні, словы ў пераносным значэнні, эпітэты.

7. Напішыце першы варыянт сачынення на чарнавіку. Перачытайце тэкст, праверце, ці ўдалося выканаць 1—5 пункты задання. Ці адпавядае колькасць абзацаў колькасці пунктаў плана?

8. Уважліва праверце пастаноўку знакаў прыпынку (звярніце ўвагу на афармленне дыялогу, калі ён уключаны ў тэкст). Праверце правапіс слоў.

Словы і выразы, якія можна выкарыстоўваць у якасці апорных:
*краіна, край, зямля;*
*падарожжа, паездка, вандроўка, вандраванне;*
*шлях, дарога, мяжа, мытня*;*
*чыгунка, чыгуначны вакзал, цягнік, самалёт;*
*чаканне, хваляванне, настрой, самаадчуванне;*
*сустрэча, знаёмства, уражанне, пачуццё;*
*паехаць, пайсці, накіравацца, адправіцца, рушыць;*
*спадабацца, здарожыцца, стаміцца;*
*Шчаслівай дарогі! Лёгкай дарогі! Усяго найлепшага! Да сустрэчы!*

## § 39. Спосабы ўтварэння назоўнікаў

**235.** Прачытайце прыказкі і прымаўкі. Растлумачце іх сэнс.

1. **Гультайства** горшае за хваробу. 2. Ранняя птушка **дзюбку** цярэбіць, а позняя — вочкі працірае. 3. На добрае **запытанне** добрае і апавяданне. 4. Не ляніся за **плужком**, будзеш з **піражком**. 5. **Адклад** не ідзе на **лад**. 6. **Птушачка** па **зернетку** збірае і сытая бывае.

Вызначце, як утвораны выдзеленыя словы.


Правообладатель Национальный институт образования

Назоўнікі ў беларускай мове ўтвараюцца рознымі спосабамі: **суфіксальным, прыставачным, прыставачна-суфіксальным, складаннем** (асноваскладаннем, словаскладаннем, складана-суфіксальным): *будаўнік, праўнук, асілак, інжынер-канструктар, снегаход, шасцікласнік*.

Суфіксы ў назоўнікаў могуць быць нулявымі, не выражанымі гукам: *адлятаць — адлёт, ціхі — ціш, блакітны — блакіт*. Такі спосаб словаўтварэння называецца ***бяссуфіксным***, ці ***нульсуфіксальным***.

**236.** Прачытайце тэкст. Які загаловак можна яму даць? Ад якіх слоў утварыліся выдзеленыя назоўнікі? Вызначце спосаб іх утварэння. Выпішыце выдзеленыя словы ў пачатковай форме, абазначце сродкі словаўтварэння.

**«Прабабуля»** зубной шчоткі была вядомая ў Старажытным Рыме яшчэ ў чацвёртым стагоддзі да нашай эры. У той жа час у **Закаўказзі** і Сярэдняй Азіі зубы чысцілі **лупінкамі** ад пладоў граната ці грэцкага арэха. **Жыхары** Сібіры і Урала карысталіся масцікай, якую варылі з сасновай смалы. А вось у В'етнаме ў далёкія часы зубы пакрывалі чорным лакам. На Русі баяры карысталіся **палачкай** з пучком шчаціння на канцы.

Зубная шчотка той канструкцыі, да якой мы прывыклі, з'явілася ў XVIII стагоддзі ў Германіі *(Паводле У. Багданава, С. Паповай)*.

**237.** Прачытайце сказы. Ці можна іх назваць тэкстам?

Яны сцвярджаюць, што калі *(у/ў)*зяць цыркуль і абвесці **акружнас*(ц/ц)*ю** *(Е/Я)*ўропу, то цэнтр яе будзе знаходзіцца на т*(э/а)*рыторыі Беларусі. **Но*(ш/ж)*ка** цыркуля будзе стаяць паміж Мінскам і Гроднам — *(у/ў)* Міры. Шмат краін аспрэчваюць права валодаць ге*(а/я)*графічным цэнтрам *(Е/Я)*ўропы. Тут, на сц*(е/я)*не старажытнага замка, і зафіксавана ге*(а/я)*графічная кро*(п/б)*ка. Беларускія *(в)*учоныя маюць на гэты конт *(у/ў)*ласнае **меркава*(н/нн)*е** *(Паводле А. Таборавай)*.

Размясціце сказы так, каб атрымаўся тэкст. Спішыце, раскрываючы дужкі. Вызначце, ад якіх слоў і якім спосабам утварыліся выдзеленыя назоўнікі.



Правообладатель Национальный институт образования

**238.** Прачытайце табліцу. Раскажыце, якое значэнне надаюць суфіксы назоўнікам. Да кожнай групы падбярыце ўласныя прыклады, запішыце, абазначце суфіксы назоўнікаў.

| Значэнне слова | Суфіксы | Прыклады |
|---|---|---|
| Асоба паводле прафесіі, занятку | *-нік-, -шчык-, -іст- (-ыст-), -ар-, -ач-, -ец-* | *Фокуснік, кранаўшчык, лыжнік, артыст, змагар, скрыпач, касец, …* |
| Асоба паводле нацыянальнасці, месца жыхарства | *-ін- (-ын-), -ук-, -ец-, -ак-* | *Балгарын, паляшук, украінец, сібірак, …* |
| Асобы і жывыя істоты жаночага полу | *-к-, -анк- (-янк-), -іц- (-ыц-), -ніц-, -ін- (-ын-)* | *Беларуска, кітаянка, гаспадыня, царыца, удзельніца, …* |
| Канкрэтныя прадметы, прылады | *-ік-, -нік-, -ак-, -ок-, -унак-* | *Помнік, прыёмнік, здымак, глыток, ласунак, …* |
| Абстрактныя паняцці і з’явы | *-осць-/-асць-, -ств-, -б-, -ізм-, -енн-, -от-* | *Ужывальнасць, сяброўства, дружба, гераізм, захапленне, лянота, …* |
| Рэчыўныя і зборныя назоўнікі | *-ін- (-ын-), -нік-, -няк-, -й-, -от-* | *Збажына, ельнік, хмызняк, пер’[йэ], лістота, …* |

● Зрабіце марфемны разбор двух абстрактных і двух рэчыўных назоўнікаў (на выбар).

З трыма назоўнікамі першай групы складзіце і запішыце сказы.

**239.** Прачытайце верш.

**Пугач**

У сасняку на скразняку
Сядзіць на зломаным суку
Пануры згорблены пугач
З маркотнай думкаю пра харч.[сн]
Калі атуліць змрок гушчар,
Ён будзе цар і гаспадар.

А ўдзень узлезе ён на сук,
Дрыжыць і ловіць кожны гук.
Упаў кавалачак кары…
Шкрабецца мышанё ў нары…
Завухкай з голаду, заплач,
Пануры згорблены пугач!

*А. Мінкін.*



Правообладатель Национальный институт образования

Выпішыце з верша назоўнікі, утвораныя суфіксальным спосабам. Падумайце, якое значэнне выражае суфікс як значымая частка ў запісаных словах.

Ад слова *гаспадар* утварыце назоўнікі. Вызначце спосабы словаўтварэння.

● Знайдзіце назоўнік, які абазначае назву маладой істоты. Вусна праскланяйце яго.

Падкрэсліце ў вершы словы, у лексічным значэнні ці ў будове якіх выяўляецца самабытнасць, адметнасць беларускай мовы. Якія з іх з'яўляюцца «гаваркімі»?

## § 40. Правапіс назоўнікаў з суфіксамі *-ак-, -ык-, -ік-, -ачк-, -ечк-*; мяккі знак перад суфіксамі *-к-, -чык-* і ў суфіксах *-аньк-, -еньк-*

**240.** Прачытайце верш. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.

**Малюнак**



Надзя ў альбоме в..сну мал..вала —
Гожая дужа в..сна паўставала.
*(?)*образ в..сны атрымаўся жаночы:
Мілая ..смешка, чаро..ныя вочы,
Кропкі в..снушак ля ясных вачэй,
**Шчочкі** палаюць за сонца ярчэй,
Ну а на шчоках — в..сёлыя **ямачкі**, —
Надзя пісала **малюнак** свой з **мамачкі.**

*В. Жуковіч.*

● Выдзеленыя назоўнікі разбярыце па саставе. У якіх словах суфікс надае слову дадатковае памяншальна-ласкальнае значэнне?

**241.** Ад прапанаваных слоў утварыце новыя словы пры дапамозе суфікса ***-ак-*** або ***-ык-.*** Размяркуйце іх па двух слупках у залежнасці ад таго, які суфікс будзе выкарыстаны.

Дубок, малаток, нож, малюнак, вецер.

Праскланяйце адзін назоўнік з суфіксам ***-ак-*** і адзін назоўнік з суфіксам ***-ык-***. Што вы заўважылі ў правапісе слоў?


Правообладатель Национальный институт образования

**242.** Разгледзьце схему правапісу слоў з суфіксамі ***-ак-***, ***-ык-***.

*арэх* + ***-ак-*** → *арэш**ак*** → *арэш**ка*** ↘ ***а***

*дождж* + ***-ык-*** → *дождж**ык*** → *дождж**ыка***

Падрыхтуйце выказванне ў навуковым стылі на тэму «Як не памыліцца ў правапісе слоў з суфіксамі ***-ак-***, ***-ык-***?».

**243.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку, падбярыце загаловак.

Мая родная мова с..рабрыстай, ч..стай крыніцай выліваецца з маёй душы. Родная мова дапамагае гл..бока зразумець і палюбіць Айчыну. Яе словы як з..рняты для мукі, як **зоркі** для неба, як н..ктар для **кветак**. Слова беларускае ж..вое, гаваркое, музычнае, напеўнае, н..паўторнае. Мы ўсе павінны бера..чы гэты спа..чынны скар.. нашых про..каў! *(Паводле У. Ліпскага).*

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.

Выпішыце выдзеленыя назоўнікі ў пачатковай форме, утварыце ад іх словы з дапамогай суфікса ***-ачк-***. У тэкстах якіх стыляў маўлення ўжываюцца словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі?

- Першы сказ разбярыце па членах сказа.
- Вызначце, якім спосабам утвораны выдзеленыя словы.

У назоўніках з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі мяккі знак пішацца:

- пасля мяккіх зычных перад суфіксам ***-к-***: *зямелька*, *яблынька*;
- пасля мяккіх [л’] і [н’] перад суфіксам ***-чык-***: *пальчык*, *агеньчык*;
- у суфіксах ***-аньк-***, ***-еньк-***: *песенька*, *рэчанька*.

**244.** Прачытайце прыказкі. Спішыце іх, устаўляючы, дзе трэба, мяккі знак. Растлумачце правапіс мяккага знака.

1. Верасок і ў цян..ку зац..вітае. 2. Бол..ка доктара шукае. 3. І на здаровай яблын..цы гнілы яблык[ф] знойдзеш. 4. І няў-



Правообладатель Национальный институт образования

мел..ка пяе, калі голасу стае. 5. Кропел..кай мора не напоіш. 6. І кругламу камен..чыку ў падмурку месца будзе. 7. Усякая зязюл..ка пра сваё кукуе.

**245.** Прачытайце верш.



Страціў слова, страціў спадчыннае слова —
Штосьці страціў у душы абавязкова!
Можа — **годнасці** хоць кропельку малую?
Можа — **мудрасці** хоць дробачку якую?
Можа — памяці хоць **зернетка-іскрынку**?
Можа — праўды хоць **пылінку-парушынку**?
Я не ведаю дакладна, што ты страціў.
Запытайся, ці не скажа табе маці...

*Н. Гілевіч.*

Спішыце, у выдзеленых назоўніках абазначце суфіксы. Якое значэнне яны надаюць словам?

Падбярыце антонім да слова *страціць.*

## § 41. Складаныя назоўнікі, іх правапіс

**246.** Прачытайце тэкст. Якія словы і выразы перадаюць асаблівасці казкі як жанру мастацкага стылю?

За трыдзевяць зямель, у трыдзясятым царстве-гаспадарстве плавае па моры-акіяне кіт. Кіт — незвычайны вадалюб. Імя яго — Велярыб. Пачуў ён лямант, які ўзнялі паны, і пытаецца:



— Чаго паны раскрычаліся?

— Няхай пан Кіт пакаштуе вунь таго быка, што пасецца на ўзгорку, — паважна запрашае пан Кубліцкі.

— А потым мы пана Кіта засмажым і з'ямо, — дадае пан Заблоцкі.

Велярыб выслухаў гэтыя прапановы, чорным вокам аглядае паноў і быка, запускае пад воблака вадзяны струмень, як вадакачка, і дае адказ:



Правообладатель Национальный институт образования